САВЕТ ФЕДЭРАЦЫІ
ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ

ПРЭЗІДЫУМ

ПАСТАНОВА

СОВЕТ ФЕДЕРАЦИИ
ПРОФСОЮЗОВ БЕЛАРУСИ

ПРЕЗИДИУМ

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

31.05.2023 № 133

г.Мінск

г.Минск

Аб правядзенні XVII рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

У адпаведнасці з пунктам 61 пераліку асобных міжнародных і рэспубліканскіх цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263, пунктамі 5 і 7 Інструкцыі аб парадку правядзення рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны", зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2007 г. № 17, Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Правесці сумесна з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускім грамадскім аб'яднаннем ветэранаў з 29 чэрвеня 2023 г. па 7 мая 2024 г. XVII рэспубліканскі фестываль народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" (далей – фестываль) у некалькі этапаў:

29 чэрвеня 2023 г. – адкрыццё фестывалю ў г. Мінску;

з 1 верасня 2023 г. па 25 сакавіка 2024 г. – абласныя, Мінскі гарадскі этапы фестывалю ў абласцях і г. Мінску;

6–7 мая 2024 г. – заключныя мерапрыемствы фестывалю ў г. Мінску.

2. Зацвердзіць склад арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XVII рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" (прыкладаецца; далей – аргкамітэт).

3. Абласным (Мінскаму гарадскому) аб'яднанням прафсаюзаў забяспечыць удзел прафсаюзных і ведамасных ветэранскіх калектываў мастацкай творчасці ў адкрыцці фестывалю, арганізацыю і правядзенне сумесна са структурнымі падраздзяленнямі абласных і

Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аглядаў-конкурсаў, арганізацыю і ўдзел пераможцаў абласных (Мінскага гарадскога) аглядаў-конкурсаў у заключных мерапрыемствах фестывалю.

4. Даручыць аргкамітэту падрыхтаваць і ўнесці на Выканкам Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прапановы па фінансаванні правядзення адкрыцця і заключных мерапрыемстваў фестывалю.

5. Фінансаванне адкрыцця і заключных мерапрыемстваў фестывалю ажыццявіць Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускаму грамадскаму аб'яднанню ветэранаў, Установе "Рэспубліканскі Палац культуры прафсаюзаў".

6. Выдаткі на праезд і пражыванне ўдзельнікаў фестывалю забяспечыць за кошт сродкаў камандзіруючых арганізацый.

7. Галоўнаму ўпраўленню сакратарыята Старшыні ФПБ (В.А.Рыжко), Унітарнаму прадпрыемству "Выдавецкі Дом "Праф-Прэс" (А.М.Манкевіч) забяспечыць асвятленне фестывальных мерапрыемстваў у прафсаюзных, рэспубліканскіх і рэгіянальных сродках масавай інфармацыі.

8. Кантроль за выкананнем дадзенай пастановы ўскласці на намесніка Старшыні ФПБ Грачова В.М., галоўнае ўпраўленне па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета ФПБ (А.У.Голубева).

Старшыня
Федэрацыі прафсаюзаў М.С.Орда

Аппарат Совета Федерации профсоюзов Беларуси
Для документов
02

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Прэзідыума Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі
31.05.2023 № 133

Для документов 02

СКЛАД

арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XVII рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

| | | |
|---|---|---|
| Гардзейчык<br>Іван Аркадзьевіч | – | старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, старшыня аргкамітэта; |
| Грачоў<br>Вадзім Мікалаевіч | – | намеснік Старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Карповіч<br>Ірына Уладзіміраўна | – | начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Луцык<br>Юрый Іванавіч | – | першы намеснік старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў; |
| Аніскевіч<br>Кацярына Аляксандраўна | – | генеральны дырэктар Установы "Рэспубліканскі Палац культуры прафсаюзаў"; |
| Вайткун<br>Марыя Іванаўна | – | саветнік галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі; |
| Галабурда<br>Іван Іванавіч | – | кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь; |
| Голубева<br>Алена Уладзіміраўна | – | начальнік галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі; |
| Куратчык<br>Сняжана Віктараўна | – | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Лучына<br>Кацярына Пятроўна | – | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарвыканкама; |
| Падгурскі<br>Пётр Мікалаевіч | – | начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама; |
| Пінчук<br>Міхаіл Іванавіч | – | дырэктар філіяла "Палац культуры ветэранаў" Установы "Рэспубліканскі Палац культуры прафсаюзаў"; |

| | |
|---|---|
| Пушнова<br>Наталля Леанідаўна | – намеснік начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама; |
| Салфетнікава<br>Таццяна Аляксандраўна | – начальнік арганізацыйна-адміністрацыйнага аддзела Установы "Рэспубліканскі Палац культуры прафсаюзаў"; |
| Шахоцька<br>Ала Канстанцінаўна | – начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама; |
| Шчаковіч<br>Аляксандр Уладзіміравіч | – старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў. |